# «А ІТАЛЬЯНЦЫ ДАВАЛІ ГАЛЕТЫ…»

## З успамінаў З. А. Плоцкай, г.п. Вялікая Бераставіца



*З. А. Плоцкая.*

- Калі маю сястру Галю - а жыве яна ў Свіслачы - мясцовыя школьнікі просяць, каб расказала пра фашысцкі канцлагер пад аўстрыйскім горадам Лінцам, яна разводзіць рукамі: «Я нічога не памятаю...»

Так пачала свой расказ Зінаіда Аляксандраўна Плоцкая, пенсіянерка з Вялікай Бераставіцы. Сёння ёй 75 год. А ў той страшны 43-ці было дванаццаць. Яна памятае ўсё да драбніц, у дзіцячую памяць урэзаўся кожны дзень у фашысцкай няволі, баракі, галодныя людзі-здані, той жах на іх тварах, калі ў лагер прыязджала душагубка. Малодшым брату і сястрычцы было 7 і 5 год, ну, а Галі, калі іх 6 жніўня вывозілі з радзімы - усяго паўтара годзіка, адкуль яна можа памятаць, дзе была? І добра, што не разумела той нечалавечай жудасці, не ведала, што пухне ад голаду, што знаходзіцца на мяжы смерці...

...А жылі мы да вайны ў тагачаснай Баранавіцкай вобласці, Івянецкім раёне, у мястэчку Налібокі, - апавядае далей Зінаіда Аляксандраўна. - Гэта самая глыб Налібоцкай пушчы. Наш тата быў чалавекам адукаваным, закончыў Лесатэхнічную акадэмію імя Кірава ў Ленінградзе. Працаваў да вайны начальнікам лестрансгаса, быў камуністам. У грамадзянскую ваяваў. Быў мабілізаваны ў першы ж дзень і Вялікай Айчыннай. Адступаючы, апынуўся каля Масквы, удзельнічаў у баях. Потым, калі пачаў стварацца партызанскі рух, быў накіраваны на акупіраваную тэрыторыю Беларусі. Помню, расказваў нам пасля вайны, як прызямліўся з парашутам на Міншчыне. Там жа, разам з татам, у Налібоцкай, Ліпічанскай пушчах ваявала ў партызанах і Надзея Катлінская, якая цяпер таксама жыве ў Вялікай Бераставіцы...

Бацька маёй субяседніцы Аляксандр Гаўрылавіч Шламанаў быў камісарам атрада імя Чапаева. А сям'ю яго - жонку і чацвёра малых дзяцей фашысты пагналі ў парабкоўства на чужыну.

- Наш дом у Налібоках спалілі, мы туліліся ў яўрэйскай хаце, якая не да канца згарэла. Помню, мама зрабіла палок, і там сядзелі. Неяк уварваліся немцы і паліцай: «Выходзьце!» Мы ў чым былі ў тым і

выйшлі на вуліцу. Не ведалі, куды і чаго гоняць. Скамандавалі ісці на развілку дарогі, там стаялі грузавікі, туды гналі людзей. Мы таксама пайшлі: мама, а за ёю гуськом дзеці. Потым, у лагеры, я ўсё чамусьці гаравала, што так і не азірнулася, не развіталася з родным куточкам. Ніхто ў тых страшных бараках не спадзяваўся, што вернецца дамоў. Ніхто...

...У Стаўбцах нявольнікаў пагрузілі ў вагоны-цялятнікі і павезлі. Першы прыпынак быў у польскім Граеве. Сям'я камісара Шламанава ехала без ежы і вады. Дзяцей, як маглі, выручалі людзі, якія паспелі штосьці схапіць з сабою. Усе клапаціліся пра маленькую Галю, інакш яна проста нікуды не даехала б.

...І вось Аўстрыя, вялізны размеркавальны лагер пад горадам Лінцам. Безліч драўляных баракаў, пагароджаных на квадраты - па пяць у кожным. Пляц з радыёрупарам на слупе, зямля ўсыпана калючым бітым шчэбнем, калючая, у два рады агароджа. У бараках - драўляныя нары, матрацы - рагожы з нейкай крапіўнай мешкавіны, такія самыя «коўдры» і больш нічога. Вошы аж кішэлі.

- Пакутавалі людзі - вам не расказаць, - Зінаіда Аляксандраўна апавядае, а голас дрыжыць. - Лагер размеркавальны, мужчын, жанчын без дзяцей забралі на работы, а засталіся такія, як мая маці, з малымі на руках, ды хворыя, нямоглыя. Штодня прыязджала душагубка, паліла трупы. Хваробы бушавалі страшна - воспа, туберкулёз, наша Галя таксама хварэла на воспу, і цяпер знакі на целе засталіся. Яна ні за што не выжыла б, каб не выручалі вязні. Лагер быў інтэрнацыянальны, тут пакутавалі, помню, і французы, і італьянцы, і палякі, і сербы. Яны любілі нашу малую, самі не даядзяць, а ёй кавалачак хлеба дадуць. Італьянцы частавалі галетамі - ім праз Чырвоны Крыж пасылкі прыходзілі... Тыя галеты і збераглі жыццё малой, хаця яна і пухла з голаду, а ў тры з паловай гады, калі вызвалілі амерыканцы, нават не хадзіла яшчэ. Худая была, як націнка.

Па начах дзіця плакала ад голаду, а восенню і зімой - і ад холаду. Як наша маці ўсё гэта перажыла - не ведаю, яна і абеды свае - а кармілі пойлам з бручкі і кавалачкам хлеба ў абед, наранку нейкая «кава» з цыкорыю - і коўдру сваю аддавала нам. А калі Галя начамі плакала, прасіла есці, мама шарыла па кішэнях у Віці, падчас знаходзіла там малюсенькі сухі кавалачак хлеба. Віця наш беражлівы не па гадах быў, запаслівы, хлеб усё на потым пакідаў, каб пасмактаць.

Кожны ранак крыкі «Аўфштайн», калі трэба бегчы на паверку, яшчэ доўга і пасля вайны стаялі ў вушах дзяцей. «Я многае помню, хоць з гадамі ўжо многае сцёрлася з памяці, - працягвае расказ Зінаіда Аляксандраўна. -Аднойчы восенню нас, старэйшых дзяцей, пагналі на работу да баўэра, і ён даў паесці бульбы. Вось гэта была радасць!

Больш у лагеры я бульбы не бачыла. Ужо ў 45-ым, калі Лінц бамбілі нашы самалёты, нас адпраўлялі разбіраць руіны. Забаронена было, крый Божа, што-небудзь узяць там сабе. Помню, адзін хлопчык знайшоў кавалачак мыла і паклаў ў кішэню. Немцы заўважылі, і больш мы таго хлопчыка не бачылі...

Вызвалілі вязняў амерыканцы. «Радаваліся ўсе так, што і расказаць не магу. Ніхто ж не спадзяваўся дажыць да гэтага дня, - кажа мая субяседніца. - Нас добра накармілі, пусцілі на нейкі склад, каб шукалі сабе вопратку.

...Маці з дзецьмі вярнулася ў свае Налібокі. А там усё зруйнавана, людзі жывуць у зямлянках. Знайшліся сардэчныя вяскоўцы, пусцілі гаротнікаў да сябе. Дзе бацька, ці жывы, сям'я не ведала. А ён не ведаў, ці выжылі яны ў няволі. Аднойчы, ужо канчаўся 45-ы год, сусед прачытаў маці ў газеце заметку, што А.Г.Шламанаў, старшыня Бераставіцкага райвыконкама, у ліку іншых узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны. Аказалася, бацька з партызанскім злучэннем дайшоў аж да Белавежскай пушчы, быў нават першым сакратаром падпольнага Свіслацкага райкома партыі. Аляксандр Гаўрылавіч адразу ж прыехаў у Налібокі, забраў сям'ю.

З той пары Зінаіда Аляксандраўна жыве ў Вялікай Бераставіцы і лічыць яе сваёй другой радзімай.

Марыя Драпеза, г.п. Вялікая Бераставіца,
2005 год.